www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
14/02-21/02/08

**АФІЦЫЙНА**
▪Беларусь атрымала 1 мільён эўра з Эўракамісіі

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Франак Вячорка зьбіраецца пікетаваць МДЛУ, а Антон Каліноўскі — БДУ

**ГРАМАДЗТВА**
▪Ці МАЗ пачне звальняць працаўнікоў?

**ПАЛІТЫКА**
▪Дыпляматы чакаюць вызваленьня ўсіх палітвязьняў

**ЭКАНОМІКА**
▪Узровень вытворчасьці падае

**КУЛЬТУРА**
▪Прэм’ера дакумэнтальнай стужкі „Вязьні сумленьня”

На мінулым тыдні назіраўся пераход беларускіх уладаў ад дэклярацыяў і сустрэчных умоваў да дзеяньняў, скіраваных на супрацу з ЭЗ. Была працягнутая кампанія па вызваленьні палітычных вязьняў.

Непакой выклікае сытуацыя з экс-кандыдатам у прэзыдэнты Аляксандрам Казуліным. Паводле чутак, улады зьбіраюцца вырашыць яе на працягу бліжэйшага тыдня-двух. Першапачатковая задума – вызваліць Казуліна пры ўмове, што ён на працягу 48 гадзінаў, ня робячы ніякіх заяваў, пакіне краіну (з адначасовым шантажам: «калі не пагодзісься, то й жонку нікуды ня выпусьцім, у тым ліку на лячэньне»), не ўдалася. Паведамляецца таксама, што перамовы вяліся «пасыльным» праз сям’ю Казуліна (так што гэта хлусьня, нібыта дочкі ўгаворвалі Казуліна пагадзіцца, яны проста перадавалі ўмовы).

Важна зазначыць таксама, што ўсе камэнтары ўладаў да сытуацыі не ўтрымліваюць і намёку на зьмену ўнутранай палітыкі, на перагляд ейных прынцыпаў, на прызнаньне якіхсьці памылак ці перагібаў. Наадварот, тлумачыцца, што, нягледзячы на бясспрэчную правату ва ўсіх пытаньнях, уключаючы падаўленьне свабоды прэсы (якую неабходна кантраляваць), крымінальны перасьлед палітычных апанэнтаў (толькі за крымінальныя дзеяньні), а таксама маральную перавагу як у дачыненьні да апанэнтаў, так і да ЭЗ, улады ідуць на саступкі выключна ў якасьці жэсту добрай волі і «гандлёвай прапановы». Такая пазыцыя дае грунт пры першай жа неабходнасьці захапіць новых палітычных закладнікаў і зноўку іх выставіць на абмен.

Гэты момант ясна разумеюць лідэры апазыцыі. Таму іх камэнтары да сытуацыі маюць вельмі стрыманы характар. У апазыцыйным лягеры разьлічваюць толькі на тое, што гандаль будзе весьціся пакрокава.

А тым часам ізноў нагадалі пра сябе прадпрымальнікі, якія бунтуюць. У цэнтры Менску яны зноўку правялі акцыю пратэсту. Трэцяя ў гэтым годзе, іх акцыя была не такой масавай, як папярэдняя. Прычынай у прадпрымальніцкіх колах называюць тое, што многія з тых, хто хацеў бы выйсьці на плошчу, папросту напужаныя, баяцца наступстваў. Па выніках папярэдніх акцыяў было затрымана каля 70 чалавек, многія зь іх пакараныя адміністратыўным арыштам, а па факце несанкцыянаванай акцыі 10 студзеня была ўзбуджаная крымінальная справа. Аднак тыя, хто выйшаў на плошчу, былі настроеныя рашуча. Варта зазначыць, што адмысловую заяву пра падтрымку прадпрымальнікаў

напярэдадні прыняла Кааліцыя аб'яднаных дэмсілаў Беларусі. Такой кансалідацыі апазыцыі ўлады вельмі баяцца і рэпрэсіяў не спыняюць.

Значную цікавасьць у краіне і за яе межамі прыцягнулі апошнія прызнаньні Лукашэнкі ў дачыненьні да аднаго з сваіх рэпрэсіўных органаў – пракуратуры.

"Галоўнае: пракуратура павінна быць максымальна даступная людзям. Любы грамадзянін павінен быць упэўнены, што, калі ён зьвярнуўся ў органы пракуратуры, па яго пытаньні будзе прынята правільнае і аб'ектыўнае рашэньне. Пракуратура ажыцьцяўляе, па сутнасьці, вышэйшы нагляд за законнасьцю", – заявіў Лукашэнка, прадстаўляючы на пасадзе генпракурора Р. Васілевіча. Пры гэтым ён падкрэсьліў, што "пракуратура зьяўляецца падкантрольнай часткай грамадзтва".

Лукашэнка сказаў, што яму не хапае інфармацыі пра сытуацыю ў праваахоўных органах, не хапае прафэсійнай і адэкватнай ацэнкі.

Ён прызнаўся: "Я адчуваю, што вакол мяне пачынаюць дзейнічаць нейкія актыўныя асобы, каб кіраваць пракуратурай». Лукашэнка таксама паставіў на сваё месца некаторых судзьдзяў і пракурораў, якія «заняліся палітыкай».

«Бачыце, іх хвалюе, як на нас паглядзіць Амэрыка або Эўразьвяз. Гэта ня вашыя праблемы, гэта праблемы прэзыдэнта краіны, часткова прэм'ер-міністра, мы будзем разьбірацца з гэтымі палітычнымі пытаньнямі. А ў вас ёсьць закон, дзейнічайце ў адпаведнасьці зь ім, супастаўляючы свае дзеяньні з запытамі нашага грамадзтва», – ясна разьмежаваў паўнамоцтвы Лукашэнка.

На думку назіральнікаў, апошнія прызнаньні Лукашэнкі на тэмы працы пракуратуры ды іншых структураў, якія тыражаваліся дзяржаўнай тэлевізіяй, могуць сьведчыць пра асаблівы псыхалягічны стан прэзыдэнта, выкліканы нейкімі нарастаючымі трывогамі. Можна выказаць меркаваньне, што экспансія расейскага капіталу, якая ўсё заўважней назіраецца ў Беларусі, каталізуе розныя працэсы ўнутры кіроўнай групоўкі. І валадару гэтыя працэсы ўсё цяжэй становіцца кантраляваць.

Паводле некаторых дадзеных, Лукашэнку не хапае інфармацыі пра сытуацыю ня толькі ва ўласных праваахоўных органах, прафэсійнай і адэкватнай ацэнкі, але і належнай інфармацыі пра сытуацыю ў Крамлі ў сувязі з прэзыдэнцкімі выбарамі, якія маюць адбыцца 2 сакавіка. Для яго пераемнік Пуціна па-ранейшаму «марсіянін».

Пэўныя надзеі ў Менску і Брусэлі зьвязваюць з адкрыцьцём прадстаўніцтва Эўракамісіі ў Беларусі. Лукашэнка даў на гэта афіцыйную згоду. І гэтая падзея, як чакаецца, павінна спрыяць дыялёгу з ЭЗ. Рэжым намераны весьці яго выключна ў галінах энэргетыкі, транспарту, транзыту і экалёгіі. У Брусэлі ж працягваюць мець спадзяваньні, што сваю працу ў Менску прадстаўніцтва Эўракамісіі зможа дапоўніць і такімі галінамі, як выкананьне правоў чалавека і свабода СМІ. Прынамсі, яно ў сваёй працы павінна кіравацца Венскай канвэнцыяй пра дыпламатычныя прадстаўніцтвы. У гэтым дакумэнце не прадугледжваецца, што сфэра дзейнасьці дыпмісіі можа абмяжоўвацца прымаючым бокам. Менавіта пазыцыю па абмежаваньні пытаўся адстойваць беларускі бок падчас працяглых перамоваў па адкрыцьці ў сябе прадстаўніцтва Эўракамісіі.

Думаецца, за гады кіраваньня рэжыму Лукашэнкі ў амбасадах краінаў-чальцоў ЭЗ у Менску быў накоплены разнастайны досьвед працы ў галінах выкананьня правоў чалавека і свабоды СМІ, які прадстаўніцтва Эўракамісіі ў Беларусі будзе вымушана ўлічваць.

Заўважны рэзананс у розных колах мае выклікаць рашэньне Менску ў аднабаковым парадку спрасьціць выдачу беларускіх візаў для грамадзянаў ЭЗ. Для грамадзянаў краін-суседзяў Польшчы, Летувы, Латвіі і Эстоніі зьменшаны кошт візаў – 25 эўра замест 60. Эўразьвяз – гэта другое па значнасьці аб'яднаньне дзяржаваў у тавараразвароце зь Беларусьсю. «Эканамічныя інтарэсы – перш за ўсё, і таму трэба не дапусціць стварэньня перашкодаў для суб'ектаў гаспадараньня ў гандлі з Эўрапейскім Зьвязам», – зазначыў Лукашэнка. Кіраўнік Беларусі мяркуе, мабыць, небеспадстаўна, што яму ўдасца пераадолець цяперашні стан адносінаў з Эўразьвязам за кошт узаемных эканамічных інтарэсаў, а таксама пэўных пэрспэктываў.

«Асабліва ў пляне сыстэмы супрацьракетнай абароны. Зараз роля Беларусі ўзрасла ў сувязі з гэтым у стакроць», – зазначыў Лукашэнка ў інтэрвію тэлеканалу «Russia Today». Ня выключана, што пра сваю значнасьць для Захаду і Ўсходу Лукашэнка пастараецца нагадаць і падчас нефармальнага саміту краінаў СНД, які мае адбыцца 22 лютага ў Маскве. Відаць, там адбудзецца апошняя размова Лукашэнкі з прэзыдэнтам Пуціным.

---

## АФІЦЫЙНА

### Беларусь атрымала 1 мільён эўра з Эўракамісіі

**Міністэрства па надзвычайных сытуацыях Беларусі атрымала грант Эўракамісіі. 1 мільён эўра прызначаны на замацаваньне праграмаў прадухіленьня й рэагаваньня на хімічныя аварыі з пагрозай міжнародных наступстваў у рэгіёне Беларусь – Латвія – Летува.**

Праект разьлічаны на два гады. Яго задача – распрацоўка мэханізмаў хуткага рэагаваньня службаў трох дзяржаў на хімічныя аварыі, абмен досьведам і падрыхтоўка пэрсаналу й насельніцтва да рэагаваньня ў выпадку аварый і гэтак далей. У рамках праекту плянуецца набыцьцё аўтамабіляў хімічнай абароны й спэцыяльнага аснашчэньня.

У транспамежным рэгіёне на паўночным захадзе Беларусі знаходзіцца шмат хімічных аб'ектаў. Існуе патэнцыйная пагроза хімічных аварый.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Франак Вячорка зьбіраецца пікетаваць МДЛУ, а Антон Каліноўскі — БДУ

**Як паведамляе «Наша Ніва», старшыні культурніцкай камісіі Партыі БНФ Франку Вячорку ўсё яшчэ не аддалі афіцыйную пастанову аб адлічэньні з журфаку БДУ. Менавіта праз гэта хлопец усё яшчэ не падаў заяву ў суд адносна свайго адлічэньня. Найхутчэй, што зробіць гэта Вячорка ўжо толькі на наступным тыдні.**

Днямі ж старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі накіраваў лісты рэктарам БДУ і Лінгвістычнага ўнівэрсытэту Васілю Стражаву і Натальлі Баранавай. Лісты тычацца адлічэньня з ВНУ студэнтаў Франка Вячоркі і Антона Каліноўскага. Баршчэўскі адзначае:

«Мне б вельмі не хацелася задзейнічаць усе свае напрацаваныя гадамі кантакты дзеля таго, каб міжнароднае супрацоўніцтва ўнівэрсытэтаў з шэрагам заходніх партнэраў было згорнутае».

Франак Вячорка таксама адзначыў, што ён зьбіраецца бліжэйшым часам падаваць заяўку на пікетаваньне будынку МДЛУ, пратэстуючы супраць адлічэньня сябра «Моладзі БНФ» Антона Каліноўскага. Сам Каліноўскі будзе падаваць такую ж заяву аб пікетаваньні БДУ ў падтрымку Вячоркі.

## ГРАМАДЗТВА

### Ці МАЗ пачне звальняць працаўнікоў?

**На Менскім аўтазаводзе рыхтуюцца да масавых звальненьняў – паведамляе "Наша Ніва" са спасылкай на сайт Expertby. Пад скарачэньне падпала б каля пяці тысяч чалавек.**

Гэта зьвязана з плянаванай зьменай уладальніка МАЗу. Звальненьні павінны адбыцца яшчэ да продажу прадпрыемства – такія ўмовы паставіў пакупнік. Такім чынам адказнасьць за непапулярныя крокі возьме на сябе дзяржава, якая зьяўляецца пакуль што ўладальнікам заводу.

На МАЗе абвяргаюць дадзеную інфармацыю

## ПАЛІТЫКА

### Дыпляматы чакаюць вызваленьня ўсіх палітвязьняў

**Пасьля вызваленьня чарговага палітзьняволенага, Андрэя Клімава, прайшло ўжо некалькі дзён. Хто будзе наступны?**

svaboda.org

Беларускае кіраўніцтва, у сваю чаргу, спадзяецца, што ЗША і Эўразьвяз зробяць пэўныя крокі ўзамен за вызваленьне палітвязьняў. Якія ж гэта могуць быць крокі? Прадстаўнік амбасады ЗША спадар Крышак сказаў:

"Вызваленьнем усіх палітзьняволеных беларуская ўлада адкрывае дарогу да дыялёгу аб паляпшэньні нашых стасункаў. Мы вельмі б хацелі распачаць зь імі гэты дыялёг. Але, як я сказаў, яны могуць адкрыць гэтую дарогу толькі вызваленьнем усіх палітзьняволеных".

Амбасадар Нямеччыны Гэбхарт Вайс заявіў, што рэагаваньне можа быць "толькі пасьля вызваленьня ўсіх палітвязьняў у Беларусі".

У францускай амбасадзе нагадалі, што амбасадарка Францыі Мірэй Мюсо яшчэ да выхаду на волю Андрэя Клімава заявіла пра неабходнасьць вызваленьня ўсіх палітвязьняў. А якія будуць рэакцыі ў адказ, яна пакуль што тлумачыць ня будзе.

## ЭКАНОМІКА

### Узровень вытворчасьці падае

**У студзені 2008 году ў краіне зьнізілася вытворчасьць шэрагу прамысловых тавараў: тэлевізараў, гадзіньнікаў, ровараў, аўтобусаў, матацыклаў ды інш.**

Паводле дадзеных Міністэрства статыстыкі й аналізу, вытворчасьць тэлевізараў скарацілася на 24%, побытавых гадзіньнікаў на 42%, ровараў на 23%.

Між тым на складах прадпрыемстваў знаходзяцца значныя запасы некаторых відаў прадукцыі. Запасы асобных прадуктаў перавышаюць месячную вытворчасьць нават у 35 разоў.

## КУЛЬТУРА

### Прэм'ера дакумэнтальнай стужкі „Вязьні сумленьня"

**У Беларусі адбылася прэм'ера новага дакумэнтальнага фільму „Вязьні сумленьня". Рэжысэрам стужкі зьяўляецца Вольга Мікалайчык.**

З роднымі палітзьняволеных размаўляе народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка.

Фільм прысьвечаны вядомым палітычным дзеячам Беларусі, некаторыя зь іх прызнаныя міжнароднай супольнасьцю „вязьнямі сумленьня".

Героямі фільму зьяўляюцца экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін, Павал Севярынец, Артур Фінькевіч, Зьміцер Дашкевіч, Андрэй Клімаў.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.